■ Асабістае

# ПАЛЮБІЎ ЯК РОДНЫХ

Іпа сёння добра памятаю карту адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення Беларусі на сцяне кабінета дэкана фізіка-матэматычнага факультэта. Яшчэ б! Мы, выпускнікі Віцебскага педінстытута 1977 года, адзін за адным падыходзілі да яе і паказвалі раён, у якім не супраць папрацаваць пасля атрымання дыплома. Я тады не быў абцяжараны жыццёвым прагматызмам, больш прыслухоўваўся да шапатлівых падказак сэрца, чым да разважлівасці розуму. З раёнаў, якія да маёй чаргі заставаліся вольнымі, торкнуў пальцам у той, што выгледзела сваім патаемным зрокам душа, — у Капыльскі. Я ўжо быў у палоне сваіх літаратурных памкненняў, і ў цэнтральную Беларусь мне заманулася паехаць таму, што мінская гаворка пакладзена ў аснову нашай літаратурнай мовы. Хацелася наяве пачуць, як людзі прамаўляюць нібы «па-пісанаму».

Але калі прыехаў на Капыльшчыну, дык, лічы, адразу зразумеў, што не змагу тут асесці надоўга, у крайнім выпадку — толькі на тры прадугледжаныя для маладога спецыяліста гады. Ну як тут жыць, на няхай сабе і ўрадлівай, але роўнай, як блін, зямлі! Палі неабсяжныя, каб табе купка хмызоўя сярод ворыва, як у нас на Віцебшчыне, — толькі грабеньчыкі прысад на небасхіле... Для сельгасвытворцаў, нічога не скажаш, лацвей, а для закалыханай хвалямі лепельскіх азёр ды пошумам бароў душы — пакутлівае выпрабаванне.

Тады я ўпершыню адчуў, што і душа мае сваю, няхай сабе і не пазначаную ані ў якім дакуменце, але ў многім лёсавызначальную прапіску. Парушыць яе — усё адно як абакрасці сябе.

Больш за ўсё на Капыльшчыне мяне, заядлага рыбака, даймала адсутнасць азёр. На Лепельшчыне яны — нібы пачэпленыя на ніткі ручаін каралі, а тут — добра калі ў якой лажбіне запрудзілі ваду ды нагадавалі лінёў і карпаў... Было такое возера ў Старыцы, дзе я выкладаў фізіку, дык слабая ўцеха...

Адным словам, не адпрацаваўшы нават тры гады, я даў з Капыльшчыны лататы, а з сабой звёз добрыя ўспаміны ды жонку Яніну, настаўніцу матэматыкі, ураджэнку Пухавіцкага раёна.

Сёння зусім не каюся, што ў свой час зрабіў такі адвольны выбар каля карты Беларусі: ні ў частцы ўзбагачэння свайго філалагічнага досведу, ні ў частцы спраўджвання вядомай песні, у якой згадваюцца Станіслава і працавітая Яніна.

Але скажу пра мову. На Міншчыне я ўпершыню пачуў з жывых вуснаў слова «вёска» замест нашай «дзярэўні». (На Віцебшчыне нават ёсць населены пункт з афіцыйнай назвай «Дзярэўня».)

Аднойчы ў выхадны дзень са Старыцы я паехаў у вёску Садавічы суседняга Слуцкага раёна, дзе пачынаў сваю настаўніцкую працу мой аднакурснік, таксама лепельскі малец Грыша Стэльмах. Што яго змусіла выбраць гэты раён, я не ведаю, але, думаю, зусім не цікавасць да мясцовай гаворкі. Мы ўсё ж вучыліся на фізіка-матэматычным, а не на філілагічным факультэце.

У Садавічах я зайшоў у хату да адной бабулі, каб спытаць, дзе ў іх жыве малады настаўнік, і мы разгаварыліся. Бабуся і сапраўды прамаўляла на чыстай літаратурнай мове — хоць бяры ды запісвай. Яна гаварыла так мілагучна, з такім нязмушаным спрытам састаўляючы слоўцы, што я нават пазайздросціў. Менавіта пасля згаданай сустрэчы з асаблівай выразнасцю адчуў, што ўсё ж нездарма прыехаў працаваць у гэтыя мясціны. Літаратурны пачатковец, я падсвядома імкнуўся прыпасці да моўнай першакрыніцы, каб, нібы зморную смагу, прагнаць сваю літаратурную нерашучасць.

Мове вучацца і з чужых вуснаў, а не толькі з матчыных. Дзед і баба Яцко, у якіх я, малады настаўнік, жыў на кватэры ў Старыцы, запамінальна, з асаблівым націскам на літару «я» казалі: «м'ясо», «п'ятніца» ну і гэтак далей. Такую яны, ураджэнцы Случчыны, рабілі спеўную аранжыроўку свайго прамаўлення. Мне было цікава і пацешна іх слухаць: разнастайнасць мовы радуе, як каторага ашчадніка гадамі нажытае багацце.

Тым часам душа мая пачала ўсё больш і больш нудзіцца на дакучлівым раўнінным ландшафце. Неставала звыклага прыроднага рытму. На Віцебшчыне яго задае чаргаванне пагоркаў і пералескаў, нізінак, пазначаных рэчкамі і талеркавымі круглавінамі балацін ды расквечанымі блакітам квітнеючага лёну ці хлебнай жаўтаспеласцю ўзгоркаў...

Не адбыўшы належнага мне ахвотна-мусовага тэрміну, ад'язджаў я з Капыльшчыны з Яняй і новым моўна-спеўным досведам, а набыты пажытак лёгка ўмяшчаўся ў невялікім чамадане.

Распісаліся мы з Яняй пагодлівым сакавіцкім днём у вёсцы Блужа Пухавіцкага раёна, цэнтры аднайменнага сельсавета. О, не падумайце, што «распісаліся» — гэта значыць зрабілі толькі фармальнае абладжванне афіцыйных дакументаў аб шлюбе. Усё ладзілася чынна, як мае быць: тут вам і марш Мендэльсона, і, няхай сабе завучаная, але ж трапная прамова старшыні сельсавета, і бомканне фужэраў з шампанскім, якія зблізкалі ў радасці Яніны і мае родзічы, і кветкі ўдзячнасці да помніка воінам Вялікай Айчыннай.

Рускі пісьменнік Мікалай Ляскоў казаў, што нос у жонкі павінен быць зграбненькі і — «піпачкай». А на Віцебшчыне ж свой тып жанчын, крывіцкі! Як мне здаецца, іх абагульненае аблічча нагадвае эстэтычныя ідэалы старажытных Грэцыі і Рыму. У нашых жанчын, зазвычай, прамыя даўжанькія насы, ясныя вялікія вочы, а вусны, як кажуць, «банцікам». Люба! Але ж мужчыны, як заведзена, цешацца не звыклым, а новым, нечаканым, як цуд.

З маленства памятаю, як у нашай вёсцы бабы казалі:

— Ай, якая дзевачка красівая: насок курносенькі, валосікі мяккія, кужэльныя, вочкі светлыя... Ягадзінка!..

Вось такіх «ягадзінак», як мне здаецца, у цэнтральнай Беларусі больш, чым у нас, усходнікаў. Мы на іх звяртаем увагу.

У маёй жонкі нос таксама зграбненькі, хоць і не зусім «піпачкай», якому аддаваў перавагу Ляскоў.

Дзякуючы Яніне маё замілаванне жывой, з каранёвымі рэгіянальнымі асаблівасцямі мовай атрымала новы працяг. І прытым проста на вяселлі.

На ўсё жыццё запомнілася мне віншаванне Янінай сястры Алены, якая на той час жыла ў Церабутах. Вострая на язык, усмешлівая і хварсістая, яна, стоячы перад намі, нібы з меха сыпала вострымі складненькімі прыслоўямі, дзеля перакanaўчасці дастаючы з меха і жартоўныя падаруначкі.

*«Дару вам каробку медзі, каб былі дзеці, як мядзведзі»,* — спеўна выводзіла Алена і падавала на далоньцы цяжкія капейкі ў карабку з-пад запалак.

Ці ўручала сястры качанок капусты: *«... каб не давала мужыку распусты».*

І мне быў падарунак:

*«Дару табе катушку нітак, каб не блытаўся каля чужых лытак».*

Ну і далей:

*«Дару табе мяшэчак проса, каб не глядзела на свякруху скоса».*

*«Дару табе мяшэчак воўны, каб скора быў жыватοк поўны».*

Я даўно заўважыў, што нашы людзі любяць, калі «складна» сказана. Ім здаецца, што такім чынам куды больш трапна і як адрэзана: і слоўца болей не дадаць.

Ну, напрыклад: «Навучы ўнучку сюкаць у анучку...» — кажуць самаўпэўненыя ганарліўцы, калі ім даюць якую параду.

І гэтую слоўную «шпільку», дарэчы, я таксама пачуў ад сваіх новых пухавіцкіх сваякоў.

Дзякуючы ім я пашыраў свае веды і аб тапаніміцы нашай Бацькаўшчыны. Праўда, нечакана, нават трохі прыкра гучалі для мяне назвы некаторых паселішчаў жончынага радзіннага кута: Віторaж, Берлеж, Вендзеж... Даволі прыкра. Куды больш звыкла — Загібелька... І чаму яе ў свой час перайменавалі ў Новы Уборак? Таксама няблага, але своеасаблівы спеўны сум выпетраны...

А вось назву вёскі Талька адразу прыняла мая душа: падалося, што чуў яе змалку, потым забыўся — і раптам з нагоды ўспомніў.

Колькі разоў даязджаў я з Мінска да Талькі, сыходзіў з электрычкі і няспешна, аглядаючы краявіды, крочыў да Церабутаў.

Непадалёк ад станцыі — масток цераз рачулку, відаць, рукаў Свіслачы, а затым — сасоннік з жоўтым, нібы прасеяным старанным печнікам для замесу раствору пясочкам на сцяжынах...

На дарозе да Алены, дзе звычайна гасціла жонка з нашым першынцам, дачкой Ірынай, мне было лёгка думаць аб будучыні, да якой з ахвотай прымерваешся ў маладым узросце, асабліва на вольных прасцягах.

Аднойчы непадалёк ад Церабутаў такое маё прымерванне раптам перапыніла нечаканае здзіўленне: у бары сярод соснаў я раптам упёрся позіркам у вялізны двухпавярховы драўляны дом з шырокімі чыстымі вокнамі. Ён стаяў не агароджаны, бо навошта: лес ахінаў ціхі затулак ад гаманлівага свету. Дом быў нефарбаваны, драўніна пацямнела, выпетрылася на дажджах і ветры да асаблівай выразнасці фактуры і, здавалася, адбівала ўжо не сонечнае святло, а яго цеплыню. І прытым не цяперашнюю, а мінулых дзесяцігоддзяў.

Мне захацелася запыніцца ды як след, да драбніц разгледзець будынак, але чамусьці засаромеўся, хоць вокны аніяк не выяўлялі прысутнасці гаспадароў, а ў лесе, як агледзець вокам, анікога не было. Напэўна, так чалавека стрымлівае само сумленне.

Праўда, заставацца пад гнятлівым ціскам цікаўнасці мне заставалася нядоўга: да хаты Алены было ўжо колькі сот метраў. Яна і расказала, што ў незвычайным для тутэйшых мясцін будынку жыве наездамі знакаміты мастак Віталь Цвірка, што гэты дом ён нібыта выкупіў у Мінску, калі яго выраклі на знос дзеля пабудовы чарговай мураванкі.

Мабыць, у вялізным драўляным доме ў свой час тулілася не адна гарадская сям'я. Сцэны набрынялі шапатлівымі словамі каханкаў, спрэчкамі суседзяў, начным плачам хворых дзетак і проста нікчэмнымі, неабавязковымі размовамі. І вось цяпер абчасаныя, падгабляваныя ў свой час бярвенні займелі магчымасць зноў парадніцца з лесам...

Якія эцюды, карціны напісаў у гэтым доме Майстра, я не ведаю. Застаецца толькі здагадвацца.

А мог бы, дарэчы, і зазірнуць калі да жывапісца. Справа ў тым, што Віталь Цвірка ў Алены Лінчык, як у добрай гаспадыні, прызвычаіўся купляць яйкі, малако, смятану, тварог... Балазе, кароўка ў яе была спраўная, малачко — добрай тлустасці ды смаку. Такім чынам, хату маёй швагеркі з домам мастака злучала выхаджаная сцяжына. Але, на жаль, так атрымалася, што мяне яна з ім не злучыла... Шкадую.

Да таго часу я ўжо быў зачараваны творчасцю мастака. Па адной карціне ў Дзяржаўным мастацкім музеі, звычайным пейзажы з веснавымі гонямі, дрэвамі раптам востра адчуў трывалую нацыянальную ідэнтычнасць жывапісца. І прытым менавіта ў пейзажнай звыкласці. Віталю Канстанцінавічу ўдавалася падбіраць адзіна магчымыя фарбы, трапна вызначаць іх меру і спалучаць у лёгка пазнавальную беларускай душою дапасаванасць. Калі б уваскрос пасля смерці ды зірнуў на яго карціну, — адразу пазнаў бы радзіму. Такое ўзнікла ў мяне ўражанне.

А калі я ўпершыню ўбачыў Свіслач у Церабутах, дык яшчэ больш зразумеў, чаму Цвірка для свайго дома выбраў менавіта гэтую мясціну. Шырокае рэчышча з заліўнымі лугамі збірае тут у адзіны суплёт не толькі маленькія ручаіны, але і куп'і «даўгалыгіх» кветак, хмызоўе духмяных вербалозаў, зараснікі лотаці, чысцюткія філіжанкі лілей на некранутай ветрам вадзе... Адна фарба змяняе другую, дапасоўваецца да іншых, ці яны перамешваюцца і ўтвараюць таксама своеасаблівую плынь, якая ўпадае ў кожную чуйную душу.

А ў дадатак — чаргаванне птушыных каленцаў, якія, здаецца, ніколі не скончацца, даючы спадзяванне і на твой доўгі працяг.

Спеўнае і рачное рэчышчы, лічы, супадаюць.

Аднойчы раніцай плыў я са спінінгам па сваёй улюбёнай Касплі, аднаму з прытокаў Заходняй Дзвіны, і амаль цэлую гадзіну — пад амаль неперапыннае куванне зязюль. Уздоўж рэчышча адна птушка змяняла другую, выводзячы сваё зычлівае «ку-ку». Добра вывучаны за доўгія гады водны шлях падаўся мне самым кароткім кірункам у вечнасць — так шчодра абяцалі на ім птушкі новыя і новыя абсягі жыцця.

Напэўна, і на Свіслачы так...

**Сяргей РУБЛЕЎСКІ.**

■ Нефармат

# ЗЛАЧЫНСТВА І ПАКАРАННЕ



**На прэс-канферэнцыі пракурор Брэсцкай вобласці Івана Наскевіча быў агучаны факт. Звычайны факт з паўсядзённай работы пракуратуры. Ён датычыць абароны правоў непаўналетняга, але не толькі.**

Жыхар Брэсцкага раёна моцна збіў свайго 14-гадовага сына за нейкую нязначную правінасць. Хлопчык, ратуючыся ад пабояў, выскачыў на вуліцу басанож. А быў канец студзеня, стаялі маразы пад 30 градусаў. Падлетак атрымаў абмаражэнне ног 1-й і 2-й ступені. (Адразу чамусьці згадалася, як фашысты гналі па марозе Зою Касмадзям'янскую без абутку...) Маці падлетка пісаць заяву ў міліцыю адмовілася. Відаць, для яе гэта звыклыя сямейныя разборкі. Але пракурор з такой пазіцыяй не пагадзіўся і распачаў у дачыненні да бацькі хлопчыка адміністрацыйны працэс. Праўда, суд Брэсцкага раёна, прызнаўшы грамадзяніна вінаватым у наўмысным прычыненні цялесных пашкоджанняў, палічыў правапарушэнне малазначным і вызваліў яго ад адказнасці. Тады пракурор вынес пратэст. І ўжо абласны суд наклаў адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе штрафу ў 1 мільён рублёў.

Як быццам бы справядлівасць адноўлена. Але хто ў выніку яе пакараны? Цалкам верагодна, што таму пабітаму і абмарожанаму падлетку потым не купілі новыя чаравікі альбо куртку, ды яшчэ і папракалі: маўляў, вось гэта з-за цябе давялося заплаціць мільён штрафу! І вымушаны хлопец быў хадзіць у тым, з чаго даўно вырас, за што раз-пораз кпілі з яго аднакласнікі, бо падлеткавае асяроддзе, як мы ведаем, даволі жорсткае. І зноў цярпеў і пакутаваў недарослы чалавек. Будзем спадзявацца, што апошняе — толькі мая фантазія. Але меркаванне, што бацька ўсвядоміў заганнасць сваіх паводзін, заплаціўшы мільён, у гэтай гісторыі надзвычай прывіднае. Каб яго пасадзілі пад адміністрацыйны арышт хаця б на месяц, дзе ўказаныя грошы ён мог бы зарабіць на грамадскіх работах — іншая рэч. Пазбавіўшыся магчымасці піць, атрымаўшы шмат часу на роздум, чалавек, можа, і задумаўся б наконт таго, што трапляць сюды лішні раз непажадана.

Перад тым, як узялася пісаць гэтыя радкі, зазірнула ў зводку на сайце УУС. У Пінску заведзена адразу некалькі крымінальных спраў па факце падробкі дакументаў адным і тым жа чалавекам. Нейкі 20-гадовы навучэнец каледжа адсканіраваў медыцынскую даведку, якая давала дазвол на пропуск заняткаў па стане здароўя. Справай тэхнікі стала размножыць бланк, а потым запоўніць і раздаць сябрам. Ён нават грошы за сваю паслугу не браў, проста дапамагаў таварышам па вучобе ўтойваць прагулы. Каму нанеслі ўрон гэтыя гора-навучэнцы? Толькі самім сабе, бо пралайдачылі і недаатрымалі веды. Але за гэтыя дзеянні хлопцу пагражае рэальны тэрмін. За кожны факт падробкі — крымінальная справа. Ну а далей вердыкт будзе выносіць суд. Такі закон.

Як і ў першым выпадку, калі пракурорскі работнік дзейнічаў выключна ў рамках закона. Несумненна, ён хацеў пакараць нягоднага бацьку, а пакараў сям'ю, у тым ліку і пацярпелага. Чаму ў нас такія законы? Відаць, ад традыцый, якія ідуць не з глыбіні вякоў, а са значна пазнейшых часоў нашай «найноўшай гісторыі», калі чалавек не лічыўся асаблівай каштоўнасцю, а вось папера была рэччу свяшчэннай. Я не за тое, што зусім не трэба караць падробшчыкаў медыцынскіх даведак, але за тое, каб давалася адэкватная ацэнка за знявагу гонару і годнасці чалавека, — несумненна, у рамках закона.

Законы ж, як вядома, уяўляюць сабой нейкае канцэнтраванае адлюстраванне грамадскай свядомасці. Іншымі словамі: якія мы, такіх мы выбіраем дэпутатаў, такія яны ствараюць законы. Усё вельмі цесна звязана ў свеце, і не трэба заўсёды ківаць на кагосьці іншага. Усе ведаюць, што адбылося з папраўкай у заканадаўчы акт аб канфіскацыі аўтамабіляў. Жыццё прымусіла, і грамадская свядомасць падштурхнула абараніць усіх патэнцыяльных ахвяр ад магчымых п'яных забойцаў. Некалі прыйдзем і да таго, што рэальна абаронім усіх пасіўных курыльшчыкаў ад тых, хто прымушае іх быць такімі. Радыкальна вырашым пытанне з гаспадарамі агрэсіўных сабак, якія не захоўваюць правілы іх утрымання. Замацуем заканадаўча многія іншыя моманты, якія дазваляць лепш абараніць жыццё і спакой нармальнага сярэднестатыстычнага чалавека. Шкада толькі, што, пакуль выхоўваецца наша свядомасць, можа змяніцца не адно пакаленне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

■ Рэзанансная справа

# СЛЕДСТВА ПА «АБЛІЧЧЫ» СКОНЧАНА

**У Брэсце падыходзіць да лагічнага завяршэння справа з падманутымі дольшчыкамі будаўнічай фірмы «Аблічча». Напомнім, што кампанія, якая займалася ўзвядзеннем элітнага жылля ў абласным цэнтры, некалькі гадоў таму спыніла сваё існаванне, спаслаўшыся на крызіс і недахоп сродкаў для працягу будаўніцтва. Пры гэтым сотні людзей унеслі свае грошы за будучыя кватэры. Многія разлічыліся ў поўным аб'ёме.**

Падманутыя людзі прайшлі ўсе магчымыя інстанцыі. Іх не пакінулі сам-насам з праблемамі. Завяршыць будаўніцтва даручылі іншым арганізацыям, дольшчыкам жа давялося даплаціць. Як ужо паведамляла наша газета, кіраўнік фірмы «Аблічча» Мікалай Клімук, больш за год таму быў узяты пад варту. І вось следства, якое працягвалася дваццаць месяцаў, скончана. Пра гэта паведаміў **пракурор Брэсцкай вобласці Іван НАСКЕВІЧ**.

Зараз грамадзянін Клімук і яго адвакаты знаёмяцца з матэрыяламі справы, якая складае 112 тамоў плюс 30 тамоў бухгалтарскіх дакументаў.

Пацярпелымі па справе прызнаны 435 чалавек. Ім прычынены ўрон на суму больш за 60 мільярдаў рублёў у выглядзе непабудаванага жылля. Следства, якое вяло ўпраўленне Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці, кваліфікавала дзеянні былога дырэктара па пяці артыкулах Крымінальнага кодэкса, сярод якіх — крадзеж шляхам злоўжывання паўнамоцтвамі ў буйным памеры, ухіленне ад выплаты падаткаў і збораў, злоўжыванне службовым становішчам. Мера пакарання па асобных з іх прадугледжвае пазбаўленне волі да дзесяці гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Усё будзе вырашаць суд, які менш чым праз месяц атрымае дакументы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

■ Погляд

# У МІНСКА — ЖАНОЧЫ ТВАР

**У чым можа быць сутнасць такой незвычайнай з'явы, як... брэнд нашай сталіцы? З дапамогай старажытных усходніх мудрых ведаў і ўласнага сучаснага навуковага аналізу паспрабую даць пэўную характарыстыку, скажам, каляроваму афармленню нашага горада. Задача не з простых.**

Дзевяць раёнаў Мінска можна падзяліць згодна з асноўнымі чатырма напрамкамі свету. **Цэнтральны раён і значную частку Савецкага можна аднесці да паўночных і пафарбаваць іх на карце ў светлыя колеры, лепш — у белы.** Гэтая каляровая сімволіка адпавядае псіхалагічнаму стану людзей-сангвінікаў, для якіх зіма, поўнач, снег — лепшыя прыкметы іх фізічнай і душэўнай раўнавагі. Аднак не варта думаць, што ў названых раёнах пражываюць у асноўным сангвінікі, хоць і ёсць пэўныя даныя, якія сведчаць аб тым, што большасць нашых людзей, якія жадаюць пабудаваць ці набыць жыллё ў паўночных раёнах, — менавіта сангвінікі.

Паўночныя раёны, па звестках летапісцаў XII—XIV стагоддзяў, вызначаліся, так бы мовіць, якасцю. Сюды прыязджалі заморскія і мясцовыя купцы, гандлявалі льном, пянькой, шоўкам. Тут выраблялі белыя сукенкі, бялізну, хусткі, ручнікі, паясы і г.д.

**Паўднёвыя раёны — Кастрычніцкі, Ленінскі, часткова Заводскі і Маскоўскі — патрабуюць выкарыстання чырвоных, бардовых, карычневых адценняў, уласцівых халерыкам.** Продкі, якія пражывалі некалі на гэтай тэрыторыі, шырока выкарыстоўвалі ў якасці ацяплення «чорную смалу» (хутчэй за ўсё, былыя летапісцы так празвалі здабыты мазут ці нафту). Паўднёвыя прадмесці нашай сталіцы ў старажытнасці вызначаліся рассяленнем майстравых людзей, якія валодалі ганчарнай, кавальскай, плавільнай, зброевай справамі, а таксама выраблялі ўпрыгажэнні з металаў і камянёў. Усё гэта было звязана з апрацоўкай агнём. І тут жа пяклі румяныя, чорныя хлябцы.

**Партызанскі, Першамайскі, частку Заводскага раёна (вул. Ангарская, Паўночны пасёлак) можна аднесці да ўсходніх раёнаў сталіцы, дзе павінны пераважаць светла- і цёмна-зялёны колер, салатава-бірузовая паліта.** Падобнае тэрытарыяльна-геаграфічнае размяшчэнне, згодна з тыбецкімі вучэннямі, вельмі спрыяльнае для прадстаўнікоў зямной, зялёнай стыхіі — меланхолікаў. Невыпадкова раён «Зялёнага Луга» ў старажытны час вылучаўся пасяленнямі «людзей дзелавых, але надумлівых, адчувальных, пераважна рамесна-мастацкага і артыстычнага профіляў», аб чым сведчаць старажытныя летапісныя звесткі. На ўсходзе жанчыны займаліся сельскай гаспадаркай, збіралі шышкі, драўняную смалу для ацяплення і ратавання драўняных пабудоў ад жукоў, грыбкоў, цвілі. Жанчыны актыўна прымянялі адвары зверабою, рамонку, мяты, валяр'яну і г.д. Да катэгорыі меланхолікаў можна аднесці і такія раёны, як Азярышча, Сцяпянка, Дражня.

**Маскоўскі, Фрунзенскі, паўночна-заходняя частка Цэнтральнага — гэта месцы, спрыяльныя для пражывання флегматыкаў. Вяснянка, Дамброўка, Мядзвежына, Міхалова, Кунцаўшчына былі месцамі земляробства, жывёлагадоўлі, палявання, рыбалоўства, а таксама пражывання людзей гаспадарчых, заможных, якія нікуды не спяшаліся, а памяркоўна вялі свае справы, што ўласціва стыхіі Вады.** На вышэйзгаданых тэрыторыях засяроджаны асноўныя водныя артэрыі сталіцы (Мінскае мора, вадасховішча Дразды, запаведнік Лебядзіны і інш. аб'екты). Будаўніцтва сталічнага аквапарку ў гэтых мясцінах выбрана вельмі ўдала, паколькі адпавядае флегматычнаму духу, павышае яго прывабнасць і бяспеку для нашых землякоў. «Водныя» раёны варта бачыць у такім каляровым спектры, як пяшчотна-блакітны, бэзавы, сіні, фіялетавы. Калі ў пералічаных раёнах павінна пераважаць блакітна-сіняя афарбоўка будынкаў, гэта створыць спакойны псіхалагічны фон, а значыць, і спрыяльны мікраклімат у сем'ях, вучэбных установах.

Наогул сучасныя мінчане па сваім псіхалагічным складзе — пераважна флегматычныя і меланхалічныя. Невыпадкова Мінск называюць горадам чыстым і... з сумнымі тварамі гараджан. Такая характарыстыка адпавядае меланхалічным перажываванням, флегматычным праявам у фізічных і псіхаэмацыянальных дзеяннях і ўчынках. Дарэчы, у многім псіхалагічны твар сталіцы сфарміравалі «шэрыя квадраты» адміністрацыйнай вытворчай і жылой забудовы горада 60-80-х гадоў мінулага стагоддзя. Варта дадаць яшчэ малую гадавую колькасць сонечных дзён. Плюс — слабая, на думку замежных гасцей, кірмашная і фестывальная дзейнасць горада, аднастайнасць тэлепраграм, малая колькасць фільмаў, тэлешоу, мультфільмаў беларускай вытворчасці...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Герб Мінска, прадстаўлены блакітна-сіняй каляровай камбінацыяй, падкрэслівае якраз флегма-меланхалічны псіхаўклад жыцця большасці гараджан. Важна цяпер уносіць элементы светлай афарбоўкі ў сучасны дызайн сацыяльна-бытавых аб'ектаў. Гэта паспрыяе актывізацыі эмоцый сангвінікаў. Калі часцей выносіць спартыўна-забаўляльныя, рэкламныя, канцэртныя мерапрыемствы з закрытых памяшканняў на плошчы, у скверы, гэта павысіць іх прывабнасць для халерыкаў. Дарэчы, каляровую афарбоўку і падсветку некалі шэрых будынкаў станоўча ацэньваюць прыкладна 80 працэнтаў мінчан. Звяртаюць на гэта ўвагу і замежныя госці.

Паколькі большасць жыхароў сталіцы — флегматыкі, то гэта павінна знаходзіць адлюстраванне і ў брэндзе горада, сімволіцы раёнаў, арганізацый і ўстаноў. Блакітна-сінія адценні будуць цалкам адпавядаць псіхаўкладу жыхароў. Дарэчы, флегматычны пачатак адзначаўся і ў гербах Радзівілаў, Сапегаў і іншых гістарычных дынастый.

Флегматызм у значнай ступені адпавядае псіхафізіялагічнаму жаночаму пачатку. У гербе Мінска гэта адлюстроўвае вобраз Божай Маці, размешчаны на сярэбраным воблаку ў цэнтры блакітнага поля, што сімвалізуе плаўнасць, грунтоўнасць, мудрасць.

Жаночы, мацярынскі вобраз часта сустракаецца ў сімволіцы гарадоў і абласцей Беларусі. Тым самым падкрэсліваецца міралюбівасць народа, імкненне да добрасуседства і павагі. На гербе Мінска такі гуманны падыход адлюстроўвае жаночы пачатак, матрыярхат, жаночую палітыку, дальнабачнасць стратэгіі флегма-меланхалічнага стаўлення да людзей. Гістарычна з-за пастаянных ваенных баталій на тэрыторыі нашай краіны колькасць мужчынскага насельніцтва была меншай за жаночую. Жанчыны рабілі асноўную працу і дома, і па-за ім. Так што ў нашага Мінска — жаночы твар.

**Сяргей АНУПРЫЕНКА, доктар філасофскіх навук, эксперт у галіне сацыяльнай экалогіі.**

■ Факт

## ПРЫТОК ПРАЦОЎНЫХ МІГРАНТАЎ У МІНСК ПАВЯЛІЧЫЎСЯ

**У Мінску за студзень—май гэтага года афармлены 4473 спецыяльныя дазволы на працаўладкаванне іншаземцаў у краіне.**

Гэта на 2003 больш, чым за такі ж перыяд 2012 года. Як расказала намеснік начальніка ўпраўлення па грамадзянстве і міграцыі ГУУС Мінгарвыканкама Святлана Піліпенка, больш за ўсё мігрантаў прыбыло з Кітая (1582), Украіны (671), Турцыі (659), Літвы (375) і Узбекістана (225). За пяць месяцаў 2013 года з хадайніцтвам аб прыцягненні замежнай рабочай сілы ў органы па грамадзянстве і міграцыі ў Мінску звярнуліся 429 арганізацый і прадпрыемстваў (у 2012-м — 318).

*«Мінск—Навіны».*

## НЕ ТАМ «ПРЫЧАЛІЛІ»

**На Віцебшчыне каля рэк і азёраў створана каля 240 зон адпачынку. Ды, на жаль, не ўсе навучыліся цывілізавана адпачываць.**

Супрацоўнікі Віцебскага абласнога Камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя разам з прадстаўнікамі іншых службаў усяго за тыдзень правялі каля 100 рэйдаў, падчас якіх было выяўлена каля 40 розных парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства. Самае распаўсюджанае — стаянка аўтатранспарту на адлегласці менш за 30 метраў ад вады (было выяўлена 12 выпадкаў). Таксама часта грамадзяне без дазволу ўладкоўваюць лодачныя прычалы. За названыя парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства аштрафаваны 17 грамадзян на суму больш за 2,1 мільёна рублёў.

## ПЕРШЫ ПАРАД... ДЗІЦЯЧАГА ТРАНСПАРТУ

**У Віцебску адбудзецца першы конкурс-парад дзіцячых калясак.**

Пакуль што невялікі вопыт правядзення аналагічных акцый у іншых рэгіёнах краіны паказаў, што заўсёды такая падзея выклікае вялікі інтарэс у мясцовых жыхароў і СМІ.

Парад можна будзе ўбачыць 29 чэрвеня на плошчы Перамогі, у Дзень горада Віцебска. Ён пройдзе ў рамках праекта «Мама і малы», які рэалізуе газета Віцебскага гарвыканкама «Віцьбічы» пры інфармацыйнай падтрымцы «Форуму бацькоў Віцебска». Тыя мамы з залатымі рукамі, якія лепш за астатніх арыгінальна ўпрыгожаць «транспарт» сваіх дзетак, стануць пераможцамі конкурсу «Казачны картэж» і атрымаюць прызы. Цікава, што ад віцебскіх татаў арганізатары чакаюць фотаздымкі са сваімі дзецьмі на конкурс «Тата і я». Лепшыя фота будуць апублікаваны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■